***Мурашка Н. У.***, *настаўніца пачатковых класаў сярэдняй школы № 196 г. Мінска, аспірант Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, магістр;*
***Шылава А. С.***, *дацэнт кафедры менеджменту і адукацыйных тэхналогій Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук*

# Праца з фальклорнымі творамі: тэхналогія «Піла» на ўроках літаратурнага чытання ў III класе

Праблема фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі выклікае неабходнасць пошуку і ўкаранення новых падыходаў, якія б спрыялі эфектыўнаму засваенню ведаў і забяспечвалі дасягненне загадзя спраектаваных вынікаў на аснове ўзаемадзеяння суб'ектаў дзейнасці. Варыянтам новага падыходу і альтэрнатывай традыцыйнаму навучанню выступае тэхналогія навучання ў супрацоўніцтве, галоўная ідэя якой заключаецца ў тым, што малодшыя школьнікі вучацца разам, дапамагаючы адзін аднаму, а не проста адначасова выконваюць прапанаванае настаўнікам заданне.

Дадзеная тэхналогія мае розныя варыянты, якія апісаны намі ў папярэдніх артыкулах [1, 2, 3], таму разгледзім магчымасці выкарыстання варыянта тэхналогіі навучання ў супрацоўніцтве «Піла» на ўроках літаратурнага чытання.

Згадаем **алгарытм рэалізацыі** варыянта тэхналогіі навучання ў супрацоўніцтве «Піла»:

**1.** Навучэнцы дзеляцца на каманды па шэсць чалавек для працы над вучэбным матэрыялам, які разбіты на пэўныя пытанні адной тэме.

**2.** Удзельнікам кожнай каманды прапануюцца для выканання заданні па пэўных пытаннях адной тэмы.

**3.** Кожны ўдзельнік каманды працуе над сваім заданнем па адным з пытанняў тэмы.

**4.** «Сустрэча экспертаў». Навучэнцы з розных каманд, якія працуюць над адным і тым жа заданнем, перамяшчаюцца, збіраюцца ў новыя групы і абменьваюцца інфармацыяй па выкананні свайго задання. Пасля абмеркавання ўсе яны становяцца экспертамі ў гэтым заданні.

**5.** Эксперты (усе навучэнцы) вяртаюцца ў свае першапачатковыя каманды пасля таго, як абмеркавалі ўсе заданні, выявілі і выправілі памылкі, пры гэтым паўтарылі тэарэтычны матэрыял ці алгарытм дзеянняў, які быў патрэбны для іх выканання.

**6.** Кожны ўдзельнік каманды тлумачыць па чарзе алгарытм выканання свайго задання.

**7.** Усе астатнія навучэнцы ў камандзе ўважліва слухаюць адказы сваіх партнёраў. Калі нешта незразумела, то задаюць выступоўцу пытанні.

**8.** Падвядзенне вынікаў. Пры падвядзенні вынікаў настаўнік можа папрасіць некалькіх вучняў з розных каманд выканаць любое з прапанаваных заданняў.

**9.** Рэфлексія якасці засваення матэрыялу, сумеснай дзейнасці і ўзаемадзеяння ў камандзе і ў групах.

Яшчэ адным эфектыўным сродкам фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі мы бачым фальклорныя творы, у прыватнасці творы вуснай народнай творчасці, якія ў дастатковай колькасці размешчаны ў вучэбных дапаможніках па вучэбных прадметах «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура». Пакажам магчымасці рэалізацыі варыянту тэхналогіі навучання ў супрацоўніцтве «Піла» пры працы з загадкамі на ўроку літаратурнага чытання ў III класе па тэме ***«Ніна Галіноўская “Сябры прыроды”. Народныя загадкі пра жывёл»***.

***Абсталяванне:*** дэманстрацыйны матэрыял з назвамі этапаў тэхналогіі для размяшчэння на дошцы, карткі для нумарацыі сталоў, выявы жывёл, карткі з заданнямі.

**Першы этап.** Настаўнік размяркоўвае навучэнцаў на каманды па шэсць чалавек. У кожнай камандзе выбіраецца капітан.

Першапачаткова будзе лепш, калі капітана, пажадана вучня з высокім узроўнем матывацыі, прызначыць настаўнік.

Удзельнікам кожнай каманды прысвойваюцца нумары: 1, 2, 3, 4, 5, 6.

**Другі этап.** Удзельнікам кожнай каманды прапануюцца для выканання заданні па пэўных пытаннях адной тэмы.

Настаўніку трэба загадзя прадумаць і падрыхтаваць заданні, дыферэнцыраваныя па складанасці

для навучэнцаў з нізкім, сярэднім і высокім узроўнямі матывацыі, каб для ўсіх стварыць сітуацыю поспеху пры іх выкананні. Так, напрыклад, мы падрыхтавалі заданні пад нумарамі **1** і **2** для навучэнцаў з **нізкім** узроўнем матывацыі; заданні пад нумарамі **3** і **4** — з **сярэднім** узроўнем матывацыі; заданні пад нумарамі **5** і **6** — з **высокім** узроўнем матывацыі.

Заданні для каманд можна запісаць на дошцы, размясціць на слайдзе ці ў канверце на картках.

***Заданні для ўсіх навучэнцаў, незалежна ад прысвоенага ім нумара:***

1. Адгадайце загадку.
2. З адгадкай складзіце сваю загадку з апорай на схему, якая размешчана на старонцы 62 вучэбнага дапаможніка [4, с. 62].

Адзін з ***варыянтаў задання нумар 1***: знайдзіце сярод малюнкаў адгадку для загадкі. Малюнкі да загадак размешчаны ў вучэбным дапаможніку [4, с. 61–62] ці могуць быць вывешаны на дошцы ў якасці дэманстрацыйнага матэрыялу (гл. эл. дадатак да часопіса).

**№ 1:**

Касматы, вусаты, есці пачынае — песенькі спявае [4, с. 61].

**№ 2:**

Не кароль, а ў кароне; не гусар, а пры шпорах; гадзінніка не мае, а час знае [4, с. 61].

**№ 3:**

З-за куста шыпуля, за нагу цапуля [4, с. 61].

**№ 4:**

Маленькі шарык пад лаўкаю шнарыць [4, с. 61].

**№ 5:**

Доўгі насок, тонкі галасок, хто яго заб'е, той сваю кроў пралье [4, с. 62].

**№ 6:**

Без станка, без рук, а кросны тчэ [4, с. 62].

**Трэці этап.** Капітаны каманд з дапамогай настаўніка размяркоўваюць, якое заданне будзе выконваць кожны з навучэнцаў.

Удзельнікі каманды працуюць самастойна над сваім заданнем наступным чынам:

– спачатку навучэнцы адгадваюць загадку;

– затым з дапамогай схемы ўспамінаюць і расказваюць, як скласці неабходную ім загадку;

– складаюць сваю загадку.

**Чацвёрты этап.** Навучэнцы, якія працуюць над адным і тым жа заданнем, але ў розных камандах, перамяшчаюцца і збіраюцца ў новыя групы. Гэта адбываецца наступным чынам: навучэнцы, якія выконвалі заданне № 1, збіраюцца за сталом № 1 і ўтвараюць новую групу, якая правярае правільнасць адгадкі на загадку, запісаную ў заданні № 1, расказваюць, як складаюцца загадкі-пытанні, дэкламуюць свае загадкі і выпраўляюць памылкі сваіх партнёраў. Так працуюць астатнія вучні, што выконвалі заданні № 2–6.

У кожнай новай групе праца навучэнцаў адбываецца наступным чынам:

– спачатку навучэнцы абменьваюцца інфармацыяй па выкананні першага задання: называюць адгадку да сваёй загадкі;

– паўтараюць тэарэтычны матэрыял: што такое загадкі-пытанні, загадкі-апісанні ці загадкі-супрацьпастаўленні і як яны складаюцца;

– затым дэкламуюць сваю загадку;

– калі ў кагосьці сустракаюцца цяжкасці з тэарэтычным матэрыялам або ў час выканання задання, астатнія вучні аказваюць яму неабходную дапамогу.

Настаўнік яшчэ раз нагадвае навучэнцам, што яны вельмі добра павінны навучыцца складаць адпаведныя загадкі, паколькі становяцца ***экспертамі*** ў сваім заданні і будуць кантраляваць правільнасць яго выканання ў іншых навучэнцаў, калі вернуцца ў сваю першапачатковую групу.

На гэтым этапе яшчэ неабходна звярнуць ўвагу на ***асаблівасці*** рэалізацыі ***групавой працы***. Трэба арганізаваць працу ў групе такім чынам, каб усе навучэнцы па чарзе прагаворвалі неабходны матэрыял, вучыліся адзін аднаму задаваць пытанні.

Пакажам на прыкладзе каманд удзельнікаў з розным узроўнем матывацыі, як адбываецца праца ў іх групах, каб кожны ўдзельнік змог стаць экспертам.

***Група навучэнцаў з нізкім узроўнем матывацыі***, якія выконвалі заданне № 1, працавала наступным чынам.

***В. 1*** *(1-шы з першай першапачатковай каманды):* Адгадваем загадку: «Касматы, вусаты, есці пачынае — песенькі спявае». Я лічу, што гэта кот. Нам неабходна прыдумаць загадку-пытанне пра ката. Што такое загадка-пытанне?

***В. 2*** *(1-шы з другой першапачатковай каманды):* Загадка-пытанне — гэта тая, якая складаецца з пытання. Як скласці загадку-пытанне?

***В. 3*** *(1-шы з трэцяй першапачатковай каманды):* Каб скласці загадку-пытанне, неабходна ўспомніць такія рысы ката, якія паказваюць толькі на яго, і ператварыць іх у пытанне. Якія рысы мае толькі кот?

***В. 4:*** *(1-шы з чацвёртай першапачатковай каманды):* Кот — гэта хатняя жывёла, любіць малако, мяўкае. Што можна яшчэ сказаць пра ката?

***В. 5*** *(1-шы з пятай першапачатковай каманды):* Кот — вусаты, пушысты, добры. А яшчэ ў яго ёсць кіпцюры і ён любіць гуляць з дзецьмі. Якая загадка-пытанне ў цябе атрымалася?

***В. 1*** *(1-шы з першай першапачатковай каманды):* Я проста ператварыў нашу загадку ў пытанне: «Хто касматы і вусаты, а калі есці пачынае, то песенькі спявае?» Якая загадка ў цябе?

***В. 2*** *(1-шы з другой першапачатковай каманды):* А так хіба можна было? Трэба было самому прыдумаць! Мая загадка: «Хто больш за ўсіх малако любіць?» А што ты прыдумала?

***В. 3*** *(1-шы з трэцяй першапачатковай каманды):* Я прыдумала такую загадку: «Чый хвост з-за канапы тарчыць?»

***В. 4*** *(1-шы з чацвёртай першапачатковай каманды):* Ты няправільна склала загадку, таму што гэта можа быць не толькі кот, але і, напрыклад, сабака.

***В. 3*** *(1-шы з трэцяй першапачатковай каманды):* Можа, тады лепш сказаць так: «Хто мяўкае з-за канапы?» А што ў цябе атрымалася?

***В. 4** (1-шы з чацвёртай першапачатковай каманды)*: Так будзе правільна. Мая загадка: «Хто без вады мыецца?» А што ў цябе атрымалася?

***В. 5** (1-шы з пятай першапачатковай каманды):* Мая загадка: «Каго ў доме мышы баяцца?»

***Група навучэнцаў з высокім узроўнем матывацыі***, якія выконвалі заданне № 6, працавала наступным чынам.

***В. 1** (6-ты з першай першапачатковай каманды):* Адгадваем загадку: «Без станка, без рук, а кросны тчэ». Гэта павук. Нам неабходна прыдумаць загадку-супрацьпастаўленне пра павука. Якая загадка называецца «загадка-супрацьпастаўленне»?

***В. 2** (6-ты з другой першапачатковай каманды):* Гэта такая загадка, дзе ёсць супрацьпастаўленне чаму-небудзь. Як скласці загадку-супрацьпастаўленне?

***В. 3** (6-ты з трэцяй першапачатковай каманды):* Трэба павука параўноўваць з іншымі жывёламі ці прадметамі. Як можна апісаць павука?

***В. 4** (6-ты з чацвёртай першапачатковай каманды):* Павук — гэта драпежнік. Ён маленькі і махнаты. Што яшчэ можна сказаць пра павука?

***В. 5** (6-ты з пятай першапачатковай каманды):* Павук мае многа рук, тчэ павуціну, раскідвае сеткі. Якую загадку ты прыдумаў?

***В. 1** (6-ты з першай першапачатковай каманды):* Не рыбак, а сеткі расстаўляе, здабычу чакае. Якая загадка ў цябе?

***В. 2** (6-ты з другой першапачатковай каманды):* Не ткач, а кросны тчэ. Што ты прыдумаў?

***В. 3** (6-ты з трэцяй першапачатковай каманды):* Махнаты, а не чмель, на дрэве жыве, сеткі пляце. Якая твая загадка?

***В. 4** (6-ты з чацвёртай першапачатковай каманды):* Ткач, а адзення не шые, сеткі робіць, а рыбу не ловіць. Што ў цябе атрымалася?

***В. 5** (6-ты з пятай першапачатковай каманды):* Паміж ветак жыве, сеткі робіць, здабычу ловіць, а не паляўнічы.

**Пяты этап.** Пасля абмеркавання заданняў выяўлення і выпраўлення памылак у іх выкананні эксперты (усе навучэнцы) вяртаюцца ў свае першапачатковыя групы (каманды).

**Шосты этап.** Кожны ўдзельнік каманды па чарзе называе адгадку, расказвае, як складаецца тая ці іншая загадка, і прадстаўляе свой варыянт загадкі.

**Сёмы этап.** Усе астатнія навучэнцы ў камандзе ўважліва слухаюць адказ сваіх партнёраў. Калі нешта незразумела, задаюць пытанні таму, хто выступае.

Навучэнцы зацікаўлены ў тым, каб добрасумленна выканаць сваё заданне: яны адказваюць не толькі за правільнасць выканання свайго задання, але і ўсіх заданняў, якія выконвалі ўдзельнікі іх каманды.

**Восьмы этап.** Падвядзенне вынікаў.

Пры падвядзенні вынікаў настаўнік можа папрасіць некалькіх вучняў з розных каманд выканаць любое з прапанаваных заданняў.

**Дзявяты этап.** Рэфлексія якасці засваення матэрыялу, сумеснай дзейнасці і ўзаемадзеяння ў камандзе і ў новых групах.

Настаўнік прапануе пытанні для абмеркавання:

— Ці спадабалася вам працаваць у камандзе?

— Ці спадабалася вам працаваць у групе экспертаў?

— Ці спадабалася вам складаць загадкі?

— Хто задаволены сваёй працай?

— Якая з загадак вам больш спадабалася?

Настаўнік па сваім меркаванні можа задаць некаторыя з прадстаўленых пытанняў.

Варыянт тэхналогіі навучання ў супрацоўніцтве «Піла» на ўроках літаратурнага чытання магчыма выкарыстоўваць таксама ў час аналізу зместу твора. Пакажам рэалізацыю прапанаванай тэхналогіі на ўроку па тэме ***«Пра адносіны да працы; беларуская народная казка “Лёгкі хлеб”»*** пры працы над казкай.

Паколькі большасць этапаў тэхналогіі, апісаных вышэй, не маюць прынцыповага адрознення, больш падрабязна мы разгледзім толькі некаторыя этапы, у якіх прапануюцца заданні, накіраваныя на фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі.

**Другі этап.** Удзельнікам кожнай каманды прапануюцца для выканання заданні па пэўных пытаннях адной тэмы.

***Заданні для ўсіх навучэнцаў, незалежна ад прысвоенага ім нумара:***

1. Адкажыце на пытанні.
2. Знайдзіце ў тэксце казкі адпаведныя ўрыўкі, прачытайце іх.
3. Назавіце самы яскравы эпізод у казцы.

**№ 1:**

Што рабіў касец?

Аб чым папрасіў касца воўк?

**№ 2:**

Чаго захацеў воўк?

Чаму вучыў касец воўка?

**№ 3:**

Якой здалася воўку праца па вырошчванні хлеба?

Што параіў яму касец?

**№ 4:**

Ці ўдалося воўку з’есці каня і чаму?

Як абараняліся ад воўка гусі?

**№ 5:**

Ці ўдалося з’есці воўку барана і чаму?

Якая прыказка з прапанаваных на старонцы 52 вучэбнага дапаможніка [5] найбольш падыходзіць па сэнсе да казкі?

**№ 6:**

Ці паспытаў воўк лёгкага хлеба?

Растлумачце, што значыць «лёгкі хлеб», «цяжкі хлеб».

**Трэці этап.** Капітаны каманд з дапамогай настаўніка размяркоўваюць, якое заданне будзе выконваць кожны з навучэнцаў.

Удзельнікі каманды працуюць самастойна над сваім заданнем.

**Чацвёрты этап.** Навучэнцы, якія працуюць над адным і тым жа заданнем, але ў розных камандах, перамяшчаюцца і збіраюцца ў новыя групы.

У кожнай новай групе праца навучэнцаў адбываецца наступным чынам:

– спачатку навучэнцы адказваюць на пытанні;

– далей яны знаходзяць ў тэксце казкі неабходны ўрывак і чытаюць яго;

– затым абменьваюцца меркаваннямі наконт самага яскравага эпізоду казкі;

– калі ў кагосьці сустракаюцца цяжкасці пры выкананні задання, астатнія вучні аказваюць яму неабходную дапамогу.

Пакажам на прыкладзе ***каманды навучэнцаў з сярэднім узроўнем матывацыі***, якія выконвалі заданне № 4, як адбываецца праца ў групе.

***В. 1*** *(4-ты з першай першапачатковай каманды):* Нам трэба адказаць на пытанне: ці ўдалося воўку з'есці каня і чаму? Не, воўк не змог з'есці каня, таму што конь абхітрыў яго. Дзе ў казцы пра гэта напісана?

***В. 2*** *(4-ты з другой першапачатковай каманды):* Я знайшоў (*чытае ўрывак*):

«...Пайшоў воўк на выган. Убачыў каня і кажа:

— Конь, конь! Я цябе з'ем.

— Што ж, — кажа конь, — еш. Толькі спачатку здымі з маіх ног падковы, каб не ламаць табе зубы аб іх.

— І то праўда, — згадзіўся воўк.

Нагнуўся ён падковы здымаць, а конь як стукне яму капытом у зубы.

Перакуліўся воўк ды ходу...» [5, с. 50].

Як абараняліся ад воўка гусі?

***В. 3*** *(4-ты з трэцяй першапачатковай каманды):* Гусі падманулі воўка, папрасілі яго спець. Дзе пра гэта напісана ў казцы?

***В. 4*** *(4-ты з чацвёртай першапачатковай каманды):* Чытае ўрывак:

«...Прыбег да рэчкі. Бачыць — на беразе гусі пасуцца. "Ці не з'есці мне іх?" — думае. Потым і кажа:

— Гусі, гусі! Я вас з'ем.

— Што ж, — адказваюць гусі, — еш. Але спачатку зрабі нам адну паслугу перад смерцю.

— Якую? — пытаецца воўк.

— Пайграй нам, а мы паскачам.

— Гэта можна. Іграць я мастак...» [5, с. 50–51].

Прачытай, што здарылася, пакуль воўк пеў.

***В. 5*** *(4-ты з пятай першапачатковай каманды):* Гусі ўзняліся ў неба і паляцелі (чытае ўрывак):

«...Сеў воўк на купіны, задраў галаву і давай выць. А гусі тым часам крыламі — мах, мах! Узняліся і паляцелі.

Злез воўк з купіны, правёў гусей вачамі і пайшоў далей ні з чым...» [5, с. 51].

Які эпізод казкі для цябе самы яскравы?

***В. 1*** *(4-ты з першай першапачатковай каманды):* Самы яскравы, на мой погляд, той, дзе воўк сустрэўся з баранам. А для цябе?

***В. 2*** *(4-ты з другой першапачатковай каманды):* Мой той, дзе касец расказваў воўку, што трэба зрабіць, каб хлеб есці. Які для цябе самы яскравы эпізод?

***В. 3*** *(4-ты з трэцяй першапачатковай каманды):* Для мяне — гэта сустрэча воўка з канём. А для цябе які?

***В. 4*** *(4-ты з чацвёртай першапачатковай каманды):* Той, дзе воўк не змог зразумець, з'еў ён барана ці не. Смешна было. А які ты назавеш?

***В. 5*** *(4-ты з пятай першапачатковай каманды):* Для мяне яскравы эпізод той, дзе касец расказаў воўку, што той лёгкага хлеба паспытаў.

Такім чынам, аналіз зместу твора, рэалізаваны паводле варыянта тэхналогіі навучання ў супрацоўніцтве «Піла», дапамагае на ўроках літаратурнага чытання замацаваць неабходны тэарэтычны матэрыял і спрыяе фарміраванню маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі.

Падводзячы вынік усяго вышэйапісанага, можна адзначыць, што выкарыстанне варыянту «Піла» тэхналогіі навучання ў супрацоўніцтве на ўроках літаратурнага чытання дазваляе ствараць натуральныя ўмовы для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі. Акрамя таго, такі від дзейнасці дапамагае вучням ацэньваць узровень сваіх ведаў і ўменняў, вучыцца аказваць дапамогу адзін аднаму, дазваляе настаўніку выхоўваць у кожнага навучэнца адказнасць за якасць засваення пройдзенага матэрыялу, за выкананне даручаных абавязкаў, а таксама поспехі сваіх сяброў па камандзе.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Мурашка, Н. У.* Тэхналогія навучання ў супрацоўніцтве на ўроках як сродак фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў: урокі беларускай мовы ў I класе / Н. У. Мурашка, А. С. Шылава // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. — 2020. — № 8. — С. 25–29.
2. *Мурашка, Н. У.* Тэхналогія навучання ў супрацоўніцтве як сродак фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў: урокі літаратурнага чытання ў II класе / Н. У. Мурашка, А. С. Шылава // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. — 2021. — №. 4. — С. 43–46.
3. *Мурашка, Н. У.* Фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў: тэхналогія «Піла» на ўроках беларускай мовы ў III класе / Н. У. Мурашка, А. С. Шылава // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. — 2022. — №. 2. — С. 11–14.
4. *Жуковіч, М. В.* Літаратурнае чытанне : вучэб. дапаможнік для 3 кл. устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з бел. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / М. В. Жуковіч. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2017. — Ч. 1. — 135 с. : іл.
5. *Жуковіч, М. В.* Літаратурнае чытанне : вучэб. дапаможнік для 3 кл. устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з бел. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / М. В. Жуковіч. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2017. — Ч. 2. — 120 с. : іл.